# § 40–41. Беларусь у еўрапейскіх войнах ранняга Новага часу

**ПАЎНОЧНАЯ ВАЙНА**
**ВАЙНА РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ СА ШВЕЦЫЯЙ**
**ВАЙНА РАСІІ З РЭЧЧУ ПАСПАЛІТАЙ**
**ЧАШНІКІ ЛОЕЎ**
**ЛІВОНСКАЯ ВАЙНА**
**КАЗАЦКА-СЯЛЯНСКАЯ ВАЙНА**
**КІРХГОЛЬМ**
**АНДРУСАЎСКАЕ ПЕРАМІР'Е**

### Прычыны Лівонскай вайны

**1. Лівонская вайна і яе наступствы.** У другой палове XVI ст. абвастрылася барацьба за кантроль над Балтыйскім морам. Асноўнымі канкурэнтамі былі Расія, Швецыя, Данія, Польшча і ВКЛ. Кожная з краін імкнулася замацаваць свой уплыў у гэтым рэгіёне. Непасрэдным аб'ектам барацьбы за ўладу з'яўлялася Лівонія.

### Ход баявых дзеянняў

Нявыплата Лівонскім ордэнам так званай «юр'еўскай даніны» і перашкоды, якія ён чыніў увозу ў Расію еўрапейскіх тавараў, прывялі да таго, што ў студзені 1558 г. Расія пачала баявыя дзеянні супраць Лівоніі. Расійскія войскі здолелі хутка авалодаць Нарвай і Дэрптам (сучасны Тарту), пад пагрозай апынуліся найбуйнейшыя парты ў Прыбалтыцы: Рэвель (сучасны Талін) і Рыга. У гэтых умовах пачаўся распад Лівоніі: заходняя частка эстонскіх зямель адышла да Даніі, паўночная з Рэвелем — да Швецыі. У 1561 г. была падпісана Віленская дамова, паводле якой Лівонскі ордэн скасоўваўся, частка яго зямель уваходзіла ў склад ВКЛ, іншая частка пераўтваралася ў васальнае ў дачыненні да ВКЛ Курляндскае герцагства.



*Выява бітвы каля Чашнікаў (на р. Уле) у нямецкай улётцы. 1564 г.*

З 1562 г. Лівонская вайна перарасла ў канфлікт паміж ВКЛ і Расіяй, а баявыя дзеянні перамясціліся




*Лівонская вайна 1558–1583 гг.*

на тэрыторыю Беларусі. У верасні 1563 г. расійскае войска авалодала Полацкам, пад пагрозай аказалася сталіца ВКЛ — Вільня. У студзені *1564 г.* у *бітве на р. Уле* (каля г. Чашнікі) войска ВКЛ на чале з гетманам Мікалаем Радзівілам Рудым здабыло перамогу, пасля чаго вайна набыла зацяжны характар.

Цяжкае становішча ВКЛ падчас Лівонскай вайны сталася адной з прычын заключэння ў 1569 г. Люблінскай уніі паміж ВКЛ і Польшчай, у выніку якой з'явілася новая дзяржава — Рэч Паспалітая. Яе саюзнікам у вайне выступіла Швецыя. Баявыя дзеянні паміж Рэччу Паспалітай і Расіяй чаргаваліся з замірэннямі.

Пералом у вайне настаў дзякуючы ўдалым дзеянням новага манарха Рэчы Паспалітай Стэфана Баторыя, які ў 1579 г. здолеў авалодаць Полацкам, а ў 1581 г. пачаў наступ на Пскоў.

**Вынікі і наступствы вайны**

У студзені 1582 г. пасля доўгіх перамоў было падпісана *Ям-Запольскае перамір'е*, згодна з якім Рэч Паспалітая замацавала за сабой паўднёвую частку Лівоніі з Рыгай. Канчаткова Лівонская вайна завяршылася заключэннем у 1583 г. Плюскага перамір'я паміж Швецыяй і Расіяй, паводле якога шведы атрымалі паўночную частку Эстоніі з Рэвелем.

Лівонская вайна значна змяніла расстаноўку палітычных сіл ва Усходняй Еўропе: з'явілася новая дзяржава, узмацніла свае пазіцыі Швецыя, Расія не атрымала выхад да Балтыйскага мора. Далучэнне новых тэрыторый да ВКЛ скасавала перашкоды для руху па Заходняй Дзвіне, што паспрыяла павелічэнню аб'ёмаў знешняга гандлю беларускіх зямель і станоўча паўплывала на іх эканамічнае развіццё.

**Войны са Швецыяй**

Барацьба за Прыбалтыку паміж Рэччу Паспалітай і Швецыяй працягнулася ў XVII ст. і вылілася ў войны *1600–1629 гг.* і *1655–1660 гг.* Нягледзячы на перамогу арміі ВКЛ над шведамі ў *бітве пад*

Даведайцеся, якая падзея ўвайшла ў гісторыю пад назвай «шведскі патоп».

*Кірхгольмам* у *1605 г.*, заключанае паміж праціўнікамі Альтмаркскае перамір'е (1629 г.) узмацніла пазіцыі Швецыі ў Балтыйскім рэгіёне. Пасля падпісання *Аліўскага міру (1660 г.)* Швецыя дасягнула вяршыні сваёй магутнасці.

### ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Крылатыя гусары — элітная частка польска-літоўскага войска. Гусарыя ўяўляла сабой атрады цяжкай кавалерыі са спецыфічнай тактыкай, узбраеннем і мела лёгка заўважны адметны атрыбут — крылы. Працяглы час гусарыя не мела сабе роўных у Еўропе, і яе атакі не раз прыносілі перамогу Каралеўству Польскаму і Вялікаму Княству Літоўскаму. Так, напрыклад, у бітве пад Кірхгольмам войска ВКЛ пад камандаваннем гетмана Яна Караля Хадкевіча разграміла сілы шведаў, якія пераўзыходзілі яго ў тры разы.

1. *У чым заключаўся сакрэт баявой эфектыўнасці гусарыі?*
2. *Назавіце асноўныя тыпы зброі крылатых гусараў. Як яна выкарыстоўвалася ў баі?*
3. *Выкажыце здагадку, якая роля надавалася крылам.*



**Смута ў Расіі. Вайна 1609–1618 гг.**

**2. Ваенныя канфлікты паміж Рэччу Паспалітай і Расійскай дзяржавай у XVII ст.** Напачатку XVII ст. супярэчнасці паміж Рэччу Паспалітай і Расійскай дзяржавай зноў абвастрыліся. Кіраўніцтва Рэчы Паспалітай намагалася скарыстацца Смутным часам у Расійскай дзяржаве для ўсталявання кантролю над Масквой і вяртання страчаных у пачатку XVI ст. тэ-

рыторый. Аднак разлік на прыход да ўлады ў Расіі Лжэдзмітрыя I не спрацаваў.

У *1609 г.* пачалася вайна Рэчы Паспалітай супраць Расійскай дзяржавы. У 1610 г. польска-літоўская армія заняла Маскву, расійскім царом быў аб'яўлены сын Жыгімонта III Вазы Уладзіслаў. Аднак у выніку магутнага народнага супраціўлення горад быў вызвалены, войскі Рэчы Паспалітай адступілі. У 1618 г. баявыя дзеянні ўзнавіліся. Польска-літоўская армія зноў учыніла паход на Маскву. Да гэтага часу зрабілася відавочным, што сілы абодвух бакоў вычарпаны. У снежні *1618 г.* было падпісанае *Дэулінскае перамір'е*, якое значна ўзмацніла пазіцыі Рэчы Паспалітай на ўсходнееўрапейскай прасторы. У склад ВКЛ вяртаўся страчаны ў 1514 г. Смаленск, а таксама Старадубшчына, у склад Польшчы — Чарнігаўшчына і Севершчына.

Успомніце, якія гістарычныя падзеі былі звязаны з дзейнасцю Лжэдзмітрыя I і Лжэдзмітрыя II.

**Смаленская вайна**

Спроба Расіі перагледзець умовы Дэулінскага перамір'я падчас *Смаленскай вайны 1632–1634 гг.* сітуацыю не змяніла. Наступ расійскай арміі на Смаленск і Полацк аказаўся няўдалы. Пасля падыходу да Смаленска войскаў ВКЛ і Польшчы на чале з каралём Уладзіславам IV расійская армія трапіла ў акружэнне і была вымушана капітуляваць.

Чаму вайна 1632–1634 гг. атрымала назву Смаленскай?

Вынікам Смаленскай вайны было заключэнне ў *1634 г. Палянаўскага міру*, які ў цэлым пацвярджаў умовы Дэулінскага перамір'я. Апроч таго, Расійскай дзяржаве вяртаўся горад Сярпейск, а Уладзіслаў IV адмаўляўся ад прэтэнзій на расійскі прастол.

**Прычыны вайны**

**3. Казацка-сялянская вайна на тэрыторыі Беларусі.** У першай палове XVII ст. паланізацыя шляхты, пашырэнне ўніяцтва, запрыгоньванне сялян і павелічэнне іх павіннасцей прывялі да абвастрэння адносін паміж кіруючымі коламі Рэчы Паспалітай і шырокімі пластамі беларускага грамадства. Ініцыятыву ў барацьбе супраць палітыкі кіраўніцтва Рэчы Паспалітай узялі казакі, якія сфарміраваліся як асобная сацыяльная група ва Украіне ў сярэдзіне XVI ст. на базе




*Ваенныя дзеянні Рэчы Паспалітай у першай палове XVII ст.*

Назавіце асноўных ваенных праціўнікаў Рэчы Паспалітай у першай палове XVII ст. на паўночных, усходніх і паўднёвых рубяжах дзяржавы.

ўкраінскага і беларускага праваслаўнага насельніцтва. У 1595 г. выбухнула маштабнае казацкае паўстанне на чале з Севярынам Налівайкам, якое пашырылася на тэрыторыю Беларусі. Нягледзячы на яго задушэнне ў 1596 г., спакою ў краіне дасягнуць не ўдалося, супярэчнасці працягвалі абвастрацца.

Няздольнасць кіруючых колаў Польшчы, у склад якой уваходзіла Украіна, вырашыць унутраныя супярэчнасці прывяла да нацыянальна-вызваленчай вайны ўкраінскага народа. Узімку *1648 г.* у Запарожскай Сечы пачалося паўстанне казакоў, на чале якога стаў Багдан Хмяльніцкі. Да канца вясны пад кантролем паўстанцаў апынулася амаль уся Левабярэжная Украіна.

**Асноўныя падзеі казацка-сялянскай вайны**

Пад уплывам падзей ва Украіне ў *1648–1651 гг.* у Беларусі разгарнулася ***казацка-сялянская вайна***. Заклікі Хмяльніцкага да ліквідацыі царкоўнай уніі, барацьбы супраць польскай шляхты знаходзілі водгук у значнай часткі беларускага праваслаўнага насельніцтва.

З прыходам казакоў у Беларусі пачаўся працэс «паказачвання» праваслаўных сялян і мяшчан. На працягу лета 1648 г. пры падтрымцы беларускіх паўстанцаў казакі занялі Гомель, Рэчыцу, Мазыр і іншыя гарады. Накіраваныя для процідзеяння казакам разрозненыя падраздзяленні арміі ВКЛ былі разбітыя. У кастрычніку 1648 г. адбылося *Пінскае паўстанне*, пасля якога ўсё Палессе апынулася пад кантролем паўстанцаў.

У студзені 1649 г. войска ВКЛ на чале з Янушам Радзівілам перайшло ў контрнаступ і да сакавіка 1649 г. выціснула паўстанцаў з Палесся, адрэзала беларускія землі ад Заходняй Украіны, што адразу звузіла арэал паўстання ў ВКЛ. Вясной — летам асноўныя сілы арміі Хмяльніцкага, што знаходзіліся ва Украіне, пачалі наступ на Валынь і Галіцыю. У ВКЛ быў накіраваны буйны́ казацкі атрад на чале з Міхаілам Крычэўскім, выхадцам са шляхты

Берасцейскага ваяводства. *31 ліпеня 1649 г.* ён пацярпеў цяжкое паражэнне ў *бітве пад Лоевам*. Шлях на Кіеў для войска ВКЛ быў адкрыты. У гэтых умовах Б. Хмяльніцкі заключыў з польскім каралём *Зборaўскі мір*, які прадугледжваў вывад з Беларусі паўстанцкіх атрадаў і стварэнне ва Украіне казацкай аўтаноміі.




Казацка-сялянская вайна 1648–1651 гг. на тэрыторыі Беларусі

У 1650 г. баявыя дзеянні ва Украіне аднавіліся, што паспрыяла актывізацыі паўстанцаў у Беларусі. Вясной 1651 г. пад іх кантролем апынуліся паўднёва-ўсходнія раёны і частка Мсціслаўшчыны. У ліпені *1651 г.* войска ВКЛ разграміла казакоў у другой *бітве пад Лоевам*, пасля чаго заняло Кіеў.

**Вынікі казацка-сялянскай вайны**

У верасні *1651 г.* казацкае кіраўніцтва было вымушана падпісаць *Белацаркоўскі мір*, які завяршыў казацка-сялянскую вайну ў Беларусі. Яна аказалася вельмі цяжкая для жыхароў беларускага Палесся

і Падняпроўя: гарады Бярэсце, Пінск, Мазыр і іншыя ляжалі ў руінах.

**Рашэнні Пераяслаўскай рады**

У 1652 г. баявыя дзеянні ва Украіне аднавіліся, Б. Хмяльніцкі звярнуўся па дапамогу да Расійскай дзяржавы. У 1653 г. на Земскім саборы ў Маскве было ўстаноўлена прыняць казакоў у расійскае падданства, што замацавалі ва Украіне рашэннем *Пераяслаўскай рады 1654 г.* Гэта азначала сур'ёзныя тэрытарыяльныя змены ва Усходняй Еўропе, якія прывялі да *вайны Расійскай дзяржавы супраць Рэчы Паспалітай 1654–1667 гг.*

**Вайна Расіі супраць Рэчы Паспалітай 1654–1667 гг.**

У выніку паспяховых наступальных дзеянняў расійскай арміі пад яе кантролем да лета 1655 г. аказалася амаль уся Беларусь са сталіцай ВКЛ Вільняй. Украінскія казакі, падтрыманыя мясцовым праваслаўным насельніцтвам, авалодалі паўднёва-ўсходняй Беларуссю. Паказачванне беларускага насельніцтва вылілася ў арганізацыю ў Падняпроўі Беларускага казацкага палка, які дзейнічаў асобна ад украінскага казацкага войска.

Пасля смерці Б. Хмяльніцкага, якая здарылася ў 1657 г., казацкая Украіна падзялілася на два лагеры — прыхільнікаў Расіі і прыхільнікаў Рэчы Паспалітай. Паміж гэтымі дзяржавамі аднавіліся баявыя дзеянні, асноўнай арэнай якіх зноў зрабілася тэрыторыя Беларусі. Вайна ператварылася ў зацяжны канфлікт, які спусташаў сродкі абодвух бакоў. У *1667 г.* было падпісана *Андрусаўскае перамір'е*, якое сведчыла пра ўзмацненне пазіцый Расійскай дзяржавы. Па выніках перамір'я Смаленшчына, Старадубшчына і Левабярэжная Украіна заставаліся ў складзе Расіі, Беларускае Падзвінне і Падняпроўе — у складзе ВКЛ.

**Вечны мір**

У *1686 г.* паміж Рэччу Паспалітай і Расіяй быў падпісаны *Вечны мір*, які канчаткова зацвердзіў вынікі вайны 1654–1667 гг. Дамова таксама прадугледжвала перадачу Кіева Расіі, што спрыяла




*Тэрыторыя Беларусі ў вайне Расійскай дзяржавы з Рэччу Паспалітай 1654–1667 гг.*

Скарыстайцеся картасхемай і дапоўніце інфармацыю аб падзеях вайны 1654–1667 гг.

пераходу кіеўскага праваслаўнага мітрапаліта пад уладу патрыярха Маскоўскага.

Войны сярэдзіны — другой паловы XVII ст. балюча адбіліся на стане беларускіх зямель. Уся краіна ляжала ў руінах, эканоміка знаходзілася ў заняпадзе, удвая скарацілася колькасць насельніцтва. Асабліва вялікія дэмаграфічныя страты былі ў Падняпроўі і Падзвінні. Сярод беларускай шляхты, вярхоў мяшчанства, уніяцкага духавенства значна ўзмацніліся працэсы паланізацыі, якія закранулі многія сферы жыцця грамадства і дзяржавы.

**Асноўная прычына Паўночнай вайны**

**4. Паўночная вайна і яе наступствы для Беларусі.** Ва Усходняй Еўропе ў пачатку XVIII ст. асноўным пытаннем у міжнародных адносінах зрабілася барацьба супраць гегемоніі Швецыі ў Балтыйскім рэгіёне. Гэты фактар аб'яднаў Расію, Данію, Саксонію і Рэч Паспалітую ў рамках антышведскага Паўночнага саюзу. Ад *1700* да *1721 г.* Усходняя Еўропа была арэнай Паўночнай вайны, якая стала новым цяжкім выпрабаваннем для насельніцтва Беларусі. Удалыя дзеянні шведскай арміі на першым этапе вывелі з вайны Данію, вымусілі адступаць з Эстляндыі расійскую армію. Асноўнай арэнай баявых дзеянняў з 1700 да 1708 г. была тэрыторыя Рэчы Паспалітай.




*Асноўныя бакі канфлікту ў Паўночнай вайне*

**Актыўныя баявыя дзеянні на тэрыторыі Беларусі**

У студзені 1706 г. актыўныя баявыя дзеянні пачаліся на тэрыторыі Беларусі. Армія Карла XII падышла да Гродна, расійская армія была вымушана адступіпць у напрамку Кіева. Шведы праследавалі

яе да Пінска, а ў пачатку лета 1706 г. пачалі прасоўванне на Валынь.

Ва ўмовах уварвання шведаў магнаты і шляхта Рэчы Паспалітай падзяліліся на прыхільнікаў і праціўнікаў Швецыі. У 1706 г. манарх Рэчы Паспалітай Аўгуст II Моцны, атрымаўшы паражэнне ад шведаў, адрокся ад прастола. Новым каралём зрабіўся прыхільнік Швецыі Станіслаў Ляшчынскі, а Рэч Паспалітая фармальна стала саюзніцай шведаў. Аднак змена ўлады прывяла да яшчэ глыбейшага крызісу ў краіне, праціўнікі С. Ляшчынскага згуртаваліся вакол расійскага імператара Пятра I.

### Найбуйнейшыя бітвы на тэрыторыі Беларусі

У 1708 г. пачаўся новы шведскі наступ супраць расійскіх войскаў, размешчаных у Беларусі. *3 ліпеня* адбылася бітва каля *мястэчка Галоўчын*, якая дазволіла шведам авалодаць Магілёвам і замацавацца ў Падняпроўі. Аднак далейшы наступ шведскай арміі аказаўся вельмі няўдалым. Разгром корпуса генерала Левенгаўпта ў *бітве каля Лясной 28 верасня 1708 г.* паставіў армію Карла XII у надзвычай цяжкае становішча. Асноўныя сілы шведскай арміі, што знаходзіліся ва Украіне, *27 чэрвеня 1709 г.* атрымалі разгромнае паражэнне ад рускіх у *бітве пад Палтавай*.

### Вынікі Паўночнай вайны

Палтаўская баталія зрабілася пераломным момантам у Паўночнай вайне. Ужо ў жніўні 1709 г. на прастол Рэчы Паспалітай вярнуўся Аўгуст II, які фактычна вывеў краіну з Паўночнай вайны. У *1721 г.* Расія з Швецыяй заключылі *Ніштацкую мірную дамову*, якая замацавала істотныя змены ў міжнародным становішчы ва Усходняй Еўропе. Расія, далучыўшы Эстляндыю і Ліфляндыю, увайшла ў лік вялікіх еўрапейскіх дзяржаў; Швецыя страціла сваю былую магутнасць і ператварылася ў дзяржаву рэгіянальнага ўзроўню; Рэч Паспалітая страціла статус моцнай еўрапейскай дзяржавы і трапіла ў глыбокую палітычную залежнасць ад Расіі.

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Адна са знакавых бітваў Паўночнай вайны адбылася на тэрыторыі Беларусі каля в. Лясная.

Да 200-годдзя бітвы на гістарычным месцы быў створаны мемарыяльны комплекс, які існуе да нашых дзён. Ён уключае капліцу святых Пятра і Паўла, пабудаваную ў 1908–1912 гг. паводле праекта архітэктара Аляксандра Гагена, манумент у выглядзе арла вядомага скульптара Арцемія Обера і памятны абеліск на месцы пахавання рускіх салдат.

1. *Пётр I назваў гэтую бітву каля в. Лясной «маці Палтаўскай перамогі». Як вы разумееце гэтыя словы?*
2. *Назавіце асноўныя элементы помніка. Паспрабуйце вызначыць, што сімвалізуе кожны з іх. Што, на ваш погляд, увасабляе помнік у цэлым?*
3. *Прывядзіце 2–3 довады, чаму варта наведаць гэты мемарыяльны комплекс.*





*Мемарыяльны комплекс на месцы бітвы каля в. Лясной. Слаўгарадскі раён Магілёўскай вобласці*

**Наступствы вайны для Беларусі**

Паўночная вайна прынесла Беларусі вялікія страты. Былі цалкам разбураны Мір, Клецк, Нясвіж, Карэлічы, Ляхавічы, разрабаваныя Гродна, Пінск, Мінск, Навагрудак, Ліда, Магілёў, насельніцтва скарацілася на траціну.




| | | | |
|---|---|---|---|
| ◉ **ВІЛЬНЯ** | Сталіцы дзяржаў | | **ПЕРАСОЎВАННЕ ВОЙСКАЎ** — расійскіх; шведскіх |
| ◎ ПОЛАЦК | Цэнтры ваяводстваў Рэчы Паспалітай і губерняў Расіі | 1707 | Месцы засяроджвання войскаў Расіі |
| ⊙ Орша | Цэнтры паветаў Рэчы Паспалітай і ўездаў Расіі | | Блакада шведамі Гродна ў 1706 г. |
| ○ Слуцк | Іншыя населеныя пункты | 03.07. 1708 | Найважнейшыя бітвы (з датамі) |
| Нясвіж | Населеныя пункты, разбураныя ў гады вайны | | |

ГРАНІЦЫ
- дзяржаў на сярэдзіну XVIII ст.
- залежных дзяржаў і тэрыторый, паміж ВКЛ і Польшчай
- сучаснай Рэспублікі Беларусь

На карце лічбамі пазначаны:
1 – Курляндскае і Земгальскае герцагства (васал Рэчы Паспалітай)
2 – Інфлянцкае ваяводства (сумеснае валоданне ВКЛ і Каралеўства Польшча)
3 – Каралеўства Прусія
4 – Каралеўства Польшча

*Паўночная вайна*

Выкарыстоўваючы картасхему, складзіце аповед пра падзеі Паўночнай вайны на тэрыторыі Беларусі.

*Для Беларусі перыяд XVI–XVIII стст. зрабіўся часам сур'ёзных выпрабаванняў. Па беларускай зямлі пракаціўся шэраг войнаў, якія прывялі да маштабных разбурэнняў і істотных дэмаграфічных страт. Тым не менш жыхары Беларусі, нягледзячы на сваю саслоўную прыналежнасць, мужна станавіліся на абарону сваёй зямлі, сваёй веры і традыцый.*

**калі ў свеце...**

1618–1648 гг. — Трыццацігадовая вайна — самая маштабная і крывавая вайна ранняга Новага часу

**на тэрыторыі Беларусі...**

XVII — пачатак XVIII ст. — шматлікія войны — адзін з найбольш складаных і неспрыяльных перыядаў у гісторыі Беларусі

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Складзіце схему «Беларусь у еўрапейскіх войнах ранняга Новага часу», адлюстраваўшы ў ёй важныя ваенныя падзеі, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі ў XVI–XVIII стст., і іх вынікі.
2. Ахарактарызуйце знешнепалітычныя мэты ВКЛ, Рэчы Паспалітай у XVI–XVIII стст. Якія сродкі выкарыстоўваліся для іх дасягнення?
3. Казацка-сялянская вайна зрабілася пачаткам разбуральнага стагоддзя ў гісторыі Беларусі. Растлумачце, як вы разумееце гэтыя словы.
4. Запоўніце табліцу «Войны Рэчы Паспалітай у XVII–XVIII стст.».

| Дата | Бакі канфлікту | Найбуйнейшыя бітвы | Мірная дамова і яе вынікі |
|---|---|---|---|
| | | | |
| | | | |

5. Якія наступствы для Беларусі мелі шматлікія войны XVI–XVIII стст.?